Источник: **«Звязда» - 2012-08-21**

# Будныя

**У беларускай гісторыі прозвішча Будны звязана з асобай вучонага-асветніка, гуманіста, рэфарматара, прапаведніка, публіцыста, друкара, філосафа, педагога, гісторыка, пераемніка культурна-асветніцкіх традыцый Францыска Скарыны — Сымона Буднага. Імя Буднага было шырока вядома ў Расіі, Польшчы, Германіі, Італіі, Швейцарыі, Галандыі, Англіі і іншых краінах Еўропы.**

Дакладнае месца нараджэння і гады жыцця Сымона Буднага невядомыя. Лічыцца, што ён жыў і дзейнічаў прыкладна ў 1530 — 1593 гадах. Скончыў факультэт вольных мастацтваў Кракаўскага ўніверсітэта, вучыўся ў Пражскім універсітэце. Творчы шлях асветнік пачаў у Вільні, куды ў 1558 годзе пераехаў па запрашэнні віленскага ваяводы і канцлера Мікалая Радзівіла Чорнага. Тут, у сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, Будны выкладаў на беларускай мове катэхізіс у пратэстанцкай школе. Пазней, у 1560 годзе, Мікалай Радзівіл Чорны перавёў Буднага пастарам у саборную кальвініцкую школу Клецка. Пры фінансавай падтрымцы беларускіх магнатаў Сымон Будны заснаваў у Нясвіжы адну з першых беларускіх друкарань, у якой у 1562 годзе выдаў на беларускай мове кнігі "Катэхізіс" і "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам". "Катэхізіс" Буднага выклікаў вялікую цікавасць у асяроддзі адукаваных людзей Еўропы. Новы перыяд у жыцці Буднага пачаўся ў Холхаве (1565-1566 гг.), дзе ён стаў адным з ідэйных правадыроў беларускай Рэфармацыі і ўзначаліў яе радыкальную плынь — антытрынітарызм. У Холхаве асветнік займаўся перакладам Бібліі і апокрыфаў. Асабліва плённым у творчасці Сымона Буднага стаў перыяд з 1573 да 1583 года, калі ён жыў у Лоску. Тут у 1574 годзе ў лоскай друкарні ўпершыню ў сусветнай літаратуры выйшаў Новы Запавет у перакладзе на польскую мову з прадмовай, каментарыямі і заўвагамі. Як справядліва адзначаюць даследчыкі, ніхто з тагачасных еўрапейскіх перакладчыкаў новазапаветных твораў не рабіў дагэтуль такой велізарнай тэксталагічнай працы, як Сымон Будны. Вучоныя прызнаюць, што дзякуючы фенаменальным аналітычным здольнасцям беларускага асветніка, яго таленту, шырокай эрудыцыі, дасканаламу веданню старажытных моў навукова-крытычны ўзровень выдання Новага Запавету 1574 г. быў самым высокім сярод усіх вядомых на той час у Еўропе. У Лоску вучоны надрукаваў свой галоўны тэалагічны трактат "Аб найгалоўнейшых палажэннях хрысціянскай веры". Будны напісаў каля 30 арыгінальных празаічных твораў і зрабіў вельмі многа перакладаў. Вучоны ведаў вялікую колькасць моў — старабеларускую, лацінскую, грэчаскую, італьянскую, польскую, чэшскую, рускую, іўрыт, стараславянскую і іншыя. Свае працы выдаваў, у асноўным, на трох мовах — беларускай, лацінскай і польскай. Творы Буднага мелі вялікую папулярнасць на Бацькаўшчыне: яго казанні з ахвотай слухалі жыхары Вільні, Клецка, Нясвіжа, Холхава, Заслаўя, Лоска, Любчы, Полацка, Вішнева. На вялікі жаль, многія кнігі, напісаныя і выдадзеныя Сымонам Будным, былі знішчаны і не дайшлі да нашага сучасніка, але ідэі, закладзеныя ў гэтых творах, аказалі вялікі ўплыў на развіццё тэалогіі, заканадаўства, беларускай літаратуры, мовы, філасофіі і гісторыі.

## Паходжанне прозвішча

Не існуе адзінай думкі адносна месцанараджэння і этнічнай прыналежнасці Сымона Буднага. Адны вучоныя мяркуюць, што Будны нарадзіўся ў Польшчы — у Мазовіі, у мястэчку Буда. Другія лічаць, што радзімай асветніка з'яўляецца Беларусь. Бясспрэчным застаецца тое, што прозвішча друкара паходзіць ад назвы населенага пункта Буда. Але сёння немагчыма вызначыць, з назвай якога канкрэтна населенага пункта — польскага або беларускага — звязана прозвішча асветніка. Паселішчы з

такой назвай неаднаразова сустракаюцца ў Польшчы. Надзвычай многа такіх населеных пунктаў было ў старажытнасці на беларускіх землях. Звязана гэта было з тым, што ў перыяд з XV да сярэдзіны XIX стагоддзяў тут было шмат прадпрыемстваў — будаў, на якіх у спецыяльных печах выпальваўся дрэўны вугаль, гналася смала, дзёгаць.




● Будны

Роднасныя прозвішчы

- ◐ Буднік
- ⊖ Буднікаў
- ⊖ Будніцкі
- ◑ Буднічэнка
- Φ Будняцкі

Назвы паселішчаў

- ▲ Буда
- ▲ Будзішча
- △ Будзішчы
- ▲ Буды
- △ Буднікі
- △ Буднік
- ▲ Будныя
- ▲ Будна
- ▲ Будніцкі

Звычайна такія прадпрыемствы размяшчаліся ў лясных масівах. Яны належалі буйным землеўладальнікам і лесапрамыслаўцам. *Будамі,* па сведчанні вучоных-анамастаў, называліся таксама лясныя пасёлкі, у якіх жылі буднікі — людзі, якія займаліся вытворчасцю вугалю, смалы і дзёгцю. У сувязі з шырокім распаўсюджаннем гэтага віду прамысловай дзейнасці ў Беларусі ўзнікла мноства паселішчаў, у аснову якіх пакладзена слова *буда*. Многія з гэтых назваў захаваліся да нашых дзён. Сустракаецца назва *Буда* і роднасныя з ёй у тапаніміі *Мінскай*(Валожынскі, Вілейскі, Дзяржынскі, Крупскі, Лагойскі, Мінскі, Слуцкі, Смалявіцкі, Старадарожскі, Барысаўскі раёны), *Магілёўскай* (Асіповіцкі, Бабруйскі, Бялыніцкі, Горацкі, Клімавіцкі, Хоцімскі раёны), *Брэсцкай* (Драгічынскі, Івацэвіцкі, Пінскі раёны), *Віцебскай* (Бешанковіцкі, Глыбоцкі, Верхнядзвінскі, Дубровенскі, Пастаўскі, Полацкі, Сенненскі, Ушацкі, Шумілінскі, Шаркаўшчынскі раёны), *Гродзенскай* (Гродзенскі, Навагрудскі раёны)

абласцей. Найбольшая колькасць паселішчаў з асновай буда налічваецца на тэрыторыі *Гомельскай* вобласці (Акцябрскі, Буда-Кашалёўскі, Добрушскі, Жлобінскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Рагачоўскі, Рэчыцкі, Светлагорскі, Хойніцкі раёны).

**Будныя ў сучаснай Беларусі**

Прозвішча *Будны* і роднасныя з ім *Буднік, Буднікаў, Будніцкі, Буднічэнка, Будняцкі* адзначаюцца амаль па ўсёй тэрыторыі Беларусі: Брэсцкі, Бярозаўскі, Жабінкаўскі, Іванаўскі, Лунінецкі, Маларыцкі раёны (Брэсцкая вобласць), Аршанскі, Браслаўскі, Гарадоцкі, Сенненскі, Талачынскі, Чашніцкі раёны (Віцебская вобласць), Магілёў, Асіповіцкі, Бабруйскі, Бялыніцкі, Горацкі, Кіраўскі, Круглянскі, Магілёўскі, Чавускі, Шклоўскі раёны (Магілёўская вобласць), Буда-Кашалёўскі, Гомельскі, Добрушскі, Ельскі, Жлобінскі, Калінкавіцкі, Кармянскі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Рэчыцкі раёны (Гомельская вобласць), Астравецкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Дзятлаўскі, Іўеўскі, Кіраўскі, Лідскі, Свіслацкі раёны (Гродзенская вобласць), Барысаўскі, Бярэзінскі, Валожынскі, Дзяржынскі, Крупскі, Маладзечанскі, Мядзельскі, Нясвіжскі, Стаўбцоўскі, Уздзенскі раёны (Мінская вобласць).

**Ігар Капылоў, кандыдат філалагічных навук, вучоны сакратар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі**